**УДК [94(476)+356.15(476)(091)] «1941/1944»:930.2(084.3)**

# КАРТМАТЭРЫЯЛЫ ПАРТЫЗАН БЕЛАРУСІ (1941–1944 гг.) ЯК ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ І СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ

***А.А. Лукашоў***

*УА «Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт», вул.Войкава 21, 225404, г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, +375(29) 7575145, Lukashov@tut.by*

У артыкуле аналізуецца патэнцыял такой своеасаблівай гістарычнай крыніцы, як картматэрыялы, а таксама тэкставых дакументаў, у якіх змешчана інфармацыя адносна выкарыстання карт партызанскім рухам на тэрыторыі Беларусі ў перыяд акупацыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Картаграфічныя дакументы шырока выкарыстоўваліся партызанамі і падпольшчыкамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі і зараз з’яўляюцца важнай крыніцай вывучэння падзей 1941–1944 гг. Адзначаецца, што гэтая група дакументаў павінна быць аб’ектам спецыялізаванага крыніцазнаўчага даследавання, паколькі карты валодаюць шэрагам уласцівасцей, якія адрозніваюць іх ад іншых відаў дакументаў.

***Ключавыя словы:*** *гістарычныя крыніцы; гісторыя партызанскага руху; картаграфічныя дакументы; тапаграфічныя карты; Вялікая Айчынная вайна.*

# КАРТМАТЕРИАЛЫ ПАРТИЗАН БЕЛАРУСИ (1941–1944 гг.) КАК ИСТОРИЧЕСКИЙ ДОКУМЕНТ И СРЕДСТВО РАЗВИТИЯ ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ

***А. А. Лукашов***

*УО Барановичский государственный университет, ул. Челюскинцев.Войкова 21, 225404, г. Барановичи, Республика Беларусь, Lukashov@tut.by*

В статье анализируется потенциал такого своеобразного исторического источника, как картматериалы, а также текстовых документов, в которых содержится информация относительно использования карт партизанским движением на территории Беларуси в период оккупации в годы Великой Отечественной войны, хранящихся в Национальном архиве Республики Беларусь. Картографические документы широко использовались партизанами и подпольщиками на оккупированной территории Беларуси и сейчас являются важным источником изучения событий 1941-1944 гг. Отмечается, что эта группа документов должна быть объектом специализированного

источниковедческого исследования, поскольку карты обладают рядом свойств, отличающих их от других видов документов.
***Ключевые слова:*** *исторические источники; история партизанского движения; картографические документы; топографические карты; Великая Отечественная война.*

## MAP MATERIALS OF THE PARTISANS OF BELARUS (1941-1944) AS A HISTORICAL DOCUMENT AND A MEANS OF DEVELOPING THE PARTISAN MOVEMENT

***A. A. Lukashov***

*Baranovichi State University", Chelyuskintsev str.Voykova 21, 225404, Baranovichi, Republic of Belarus, Lukashov@tut.by*

The article analyzes the potential of such a unique historical source as maps, as well as text documents that contain information on the use of maps related to the partizan movement in Belarus during the occupation during the Great Patriotic War, stored in the National Archives of Belarus. Map documents were widely used by partizans and underground fighters in the occupied territory of Belarus and now are important source for studying the events of 1941-1944. It is noted that this group of documents should be the subject of specialized source research, as maps have a number of properties that distinguish them from other types of documents.
***Key words:*** *historical sources; history of partizan movement; map documents; topographic maps; The Great Patriotic War.*

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь маюцца шматлікія фонды, звязаныя з партызанскім рухам і падпольнай барацьбой на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Да ліку такой групы фондаў, у якой захоўваюцца картаграыфічныя дакументы адносяцца: фонды Беларуска штаба партызанскага руху (фонд №1450; усяго 11114 спраў), фонды партызанскіх фарміраванняў (фонды №№ 1399–1408; усяго 7172 справы), справы вопісу №33а фонду Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі №4п (718 спраў), фонды падпольных партыйных органаў (фонды №№ 1329, 1332–1334, 1336–1337, 1341, 1350, 1364–1365; усяго 1482 справы). Усяго 20486 спраў. І ў большасці спраў гэтых фондаў прысутнічаюць картаграфічныя дакументы (ці картаграфічныя матэрыялы), таму можна упэўнена казаць, што колькасць картаграфічных дакументаў такой тэматыкі вымяраецца тысячамі адзінак. Пра

выкарыстанне партызанамі тапаграфічных карт сведчаць, у прыватнасці, мемуары ўдзельнікаў партызанскага руху. У мемуарах камандзіра 1-й Бабруйскай брыгады Віктара Ільіча Лівенцева, камандзіра партызанскай брыгады «Няўлоўныя» Міхаіла Сідаравіча Пруднікава, радавога ўдзельніка партызанскага руху Мікалая Ігнацьевіча Счэнсновіча і іншых гаворыцца пра выкарыстанне карт пры падрыхтоўцы і правядзенні аперацый, а таксама ў разведдзейнасці [1; 2; 3]. У мемуарах начальніка Беларуска штаба партызанскага руху Петра Захаравіча Калініна і сакратара Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б Васіля Іванавіча Казлова прыводзіцца некалькі прыкладаў партызанскіх аперацый, поспех якіх быў забяспечаны ўмелым выкарыстаннем карт, упамінаецца пра выкарыстанне карт у арганізацыйнай дзейнасці штаба, якая ажыццяўлялася цераз лінію фронта [4; 5]. Як бачым, гэтыя кнігі напісаны ўдзельнікамі партызанскага руху рознага ўзроўню – ад радавога да камандзіра атрада і начальніка штаба. Акрамя мемуараў, партызанскія карты ўзгадваюцца ў шэрагу гістарыяграфічных прац. Так, у гістарычнай рабоце М.А. Якубоўскага ўзгадваецца пра забеспячэнне партызан тапаграфічнымі картамі [6, с. 16].

Пры гэтым, калі гаварыць пра партызанскія карты, важна адрозніваць два розныя паняцці: а) карты, у тым ліку тапаграфічныя, выдадзеныя паліграфічным спосабам на картаграфічных прадпрыемствах, якія выкарыстоўваліся партызанамі ў сваёй дзейнасці; б) вынік картаграфічнай дзейнасці саміх партызан - створаныя імі картаграфічныя дакументы з рукапіснай, і таму ўнікальнай інфармацыяй. Такім чынам, найважнейшай прыкметай картаграфічнага дакумента беларускіх партызан Вялікай Айчыннай вайныз'яўляецца наяўнасць адбіткаў іх картаграфічнай дзейнасці. Канкрэтнымі праявамі такой дзейнасці з'яўляюцца: нанесеная пры дапамозе пяра і алоўка на выдадзеную друкарскім спосособам тапакарту інфармацыя (баявыя дзеянні, разведаныя і г. д.); стварэнне копій такіх карт, часта з удакладненнем і змяненнем тых ці іншых элементаў картаграфічнай асновы (стварэнне копій тапакарт было неабходна, паколькі выдадзеных друкакарскім спосабам тапакарт часта нехапала); стварэнне малюнкаў мясцовасці ці схем “на вока”. Картаграфічныя матэрыялы (за выключэннем малюнкаў мясцовасці) маглі быць створаны партызанамі толькі з дапамогай тапакарт, якія меліся ў распараджэнні народных

мсціўцаў, паколькі партызаны, не ажыццяўлялі тапаграфічную здымку акупіраванай тэрыторыі з выкарыстаннем геадэзічных інструментаў. Копіі тапакарт ствараліся з выкарыстаннем не толькі з спецыяльнай празрыстай паперы (кальцы), але і на самай рознай па якасці: абгортачнай, на шпалерах, аркушах з вучнёўскіх сшыткаў, адваротным баку агітацыйных плакатаў і г.д. Стварэнне такіх копій ажыццяўлялася пры дапамозе простага святластала, які ўяўляў сабой шкляную стальніцу і крыніцу святла пад ёй, або іншага падобнага кустарна зробленага прыстасавання. Такі святлакапір няцяжка было зрабіць у палявых умовах. Капіраванне часта рабілася з захаваннем маштабу ці яго павелічэннем на адвольную велічыню. Тапаграфічная аснова, у многіх выпадках, пераносілася на копію не поўнасцю – некаторыя яе элементы, якія партызаны маглі палічыць лішнімі, такія як, напрыклад, градусная сетка, не капіраваліся.

Дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія маюць дачыненне да выкарыстання карт у партызанскім руху, можна падзяліць на дзве групы. Першая – гэта розныя тэкставыя дакументы, якія ўтрымліваюць колькасную і якасную інфармацыю аб выкарыстанні карт партызанамі: справаздачы, нарад-накладныя на вотпуск тапакарт, розныя дакументы ўліку, перадачы, руху і захоўвання тапаграфічных карт [7]. У гэтых дакументах даецца інфармацыя пра наяўнасць ў Беларускім штабе партызанскага руху тапаграфічных карт рознага маштабу на тэрыторыю БССР і сумежныя тэрыторыі; звесткі пра паступленні карт ад Галоўнага ваенна-тапаграфічнага ўпраўлення Чырвонай арміі і іх перадачу партызанскім атрадам і злучэнням. Маюцца шматлікія заяўкі партызанскіх камандзіраў на карты для забеспячэння сваёй дзейнасці. Гэтыя заяўкі ў асноўным адрасаваны да начальніка ці намесніка начальніка аператыўнага аддзела Беларуска штаба партызанскага руху. Інфармацыю па гісторыі выкарыстання карт можна пачэрпнуць і з іншых дакументаў. Спасылкі на карты розных маштабаў маюцца на многіх загадах, справаздачах аб праведзенай баявой і разведвальнай рабоце. З перапіскі паміж камандзірамі атрадаў і з камандаваннем злучэнняў можна даведацца пра картаграфічнае забеспячэнне тых ці іншых аперацый. Інструкцыі па вядзенню дакументацыі атрада, якія дасылаліся з вышэйстаячых інстанцый (напрыклад з Беларуска штаба партызанскага руху) патрабавалі ад камандзіраў атрадаў суправаджаць картамі пэўныя

дакументы і вызначалі парадак іх афармлення [8]. У 1943 г. кіраўніцтвам Беларуска штаба партызанскага руху партызанаскім фарміраванням за лініяй фронту была разаслана спецыяльная кніжка-інструкцыя, у якой паказаны дызайн умоўных знакаў для пазначэння спецыяльнай ваеннай інфармацыі (такой, як размяшчэнне вайскаў, розных відаў ваеннай тэхнікі і г.д.) [9]. Выданне і распаўсюджванне сярод партызанскіх фарміраванняў гэтай кніжкі павінна было ўніфікаваць умоўныя знакі, якімі адлюстроўваецца змест партызанскіх карт. Азнаямленне з картаграфічнымі дакументамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь паказвае, што большасць інфармацыі на партызанскіх картах паказана пры дапамозе такіх “стандартызаваных” умоўных знакаў – у адпаведнасці з гэтымі інструкцыямі. Тым не менш, ў архівах маецца мноства картаграфічных дакументаў, створаных з выкарыстаннем адвольных умоўных знакаў, з нізкай картаграфічнай дакладнасцю. На якасць карт уплываў узровень валодання картаграфічным майстэрствам тых, хто гэтыя дакументы ствараў, разумення мэтаў і метадаў картаграфіі, а таксама наяўнасцю неабходных тэхнічных сродкаў.

Другая група – гэта ўласна картаграфічныя дакументы. Яны маюцца як у справах Беларуска штаба партызанскага руху, так і ў справах кожнага атрада. Яны могуць паслужыць важнай крыніцай для рэканструкцыі баёў ці становішча на акупіраванай тэрыторыі. У прыватнасці, каштоўнай крыніцай з’яўляюцца разведвальныя планы гарадоў. На іх пазначана размяшчэнне нямецкіх грамадзянскіх і ваенных устаноў, казарм і ўмацаванняў. Пазначаны межы гета, спаленых (разбураных) кварталаў і кварталаў з якіх было адселена мясцовае насельніцтва. Шматлікія аператыўныя і разведвальныя зводкі, якія камандаванне брыгад і атрадаў перадавала ў аператыўныя цэнтры пры падпольных райкамах і абкамах, выкарыстоўваліся для стварэння аператыўных карт, якія ахоплівалі адпаведную тэрыторыю. Гэтыя карты звычайна ўтрымліваюць больш абагульнёную і сістэматызаваную інфармацыю.

Адсюль вынікаюць і магчымыя напрамкі даследавання дадзена блока дакументаў. Першы напрамак – вывучэнне гісторыі выкарыстання карт партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Другі напрамак – вывучэнне партызанскіх картаграфічных

дакументаў, як крыніцы па гісторыі антыфашысцкага супраціўлення ў тыле ворага.

Такім чынам, значэнне даследавання комплексу картаграфічных дакументаў заключаецца ў тым, што дазваляе праводзіць геаграфічна дакладную рэканструкцыю падзей і абставін партызанскага руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яны з'яўляюцца трывалым падмуркам для стварэння картаграфічных прац па гэтай тэме.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Ливенцев В. И.* Партизанский край. 4-е изд., испр. и доп. Минск: Беларусь, 1983.
2. *Сченснович Н. И.* Записки актера и партизана. Минск : Беларусь, 1976.
3. *Прудников М. С.* Неуловимые. М.: Воениздат, 1961.
4. *Калинин П. З.* Партизанская республика. М.: Воениздат, 1964.
5. *Козлов* В. И. Люди особого склада. М.: Молодая гвардия, 1952.
6. *Якубовский Н. А.* Помощь советского тыла партизанам: материально-техническое обеспечение. Минск : Беларусь, 1973.
7. Інструкцыі па выкарыстанні ўмоўных знакаў карты // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 1450. Воп. 1. Сп. 17. Арк. 14; НАРБ. Ф. 1450. Воп. 2. Сп. 993–1009.
8. Інструкцыі па вядзенню дакументацыі атрада // НАРБ. Ф. 1450. Воп. 1. Сп. 42. Арк. 72.
9. Інструкцыі па вядзенню дакументацыі атрада // НАРБ. Ф. 1450. Воп. 2. Сп. 42. Арк. 61–74.